Установа адукацыі
“Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”
Інстытут павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Рэктар універсітэта
Н.У.Карчэўская
10.01.2024 г.
Рэг. № ВД-40Пп/эвуч.

# ВУЧЭБНАЯ ПРАГРАМА ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ, МОДУЛЮ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ ПЕРАПАДРЫХТОЎКІ

# АСНОВЫ ЭТНАГРАФІІ І ФАЛЬКЛОРУ

спецыяльнасць перападрыхтоўкі: 9-08-1013-01 Культурна-адпачынкавая дзейнасць
кваліфікацыя: арганізатар культурна-адпачынкавай дзейнасці
у адпаведнасці з прыкладным вучэбным планам па спецыяльнасці перападрыхтоўкі, зацверджаным 7 ліпеня 2023 г. № 25-13/34

Мінск, 2024

Распрацоўшчык праграмы:
*Т.В.Валодзіна,* прафесар кафедры культуралогіі і псіхолага-педагагічных дысцыплін Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў установы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”, доктар філалагічных навук, прафесар

Рэкамендавана да зацвярджэння:

кафедрай культуралогіі і псіхолага-педагагічных дысцыплін Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў установы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”
Пратакол пасяджэння ад 12.03.2024 № 5

саветам Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў установы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”
Пратакол пасяджэння ад 28.03.2024 № 3

навукова-метадычным саветам установы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”
Пратакол пасяджэння ад 10.04.2024 № 4

# УВОДЗІНЫ

Вучэбная праграма па вучэбнай дысцыпліне, модулю “Асновы этнаграфіі і фальклору” (далей – вучэбная праграма) распрацавана для рэалізацыі адукацыйнай праграмы перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць сярэднюю спецыяльную адукацыю, у адпаведнасці з патрабаваннямі адукацыйнага стандарту перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў па спецыяльнасці 9-08-1013-01 “Культурна-адпачынкавая дзейнасць”, зацверджаным пастановай Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь ад 06 ліпеня 2023 № 95.

*Мэта вывучэння вучэбнай дысцыпліны*: сфарміраваць у слухачоў сістэму ведаў аб структуры рытуальна-абрадавых комплексаў, сістэме жанраў беларускага фальклору, асаблівасцях сённяшняга бытавання вусна-паэтычнай творчасці.

*Задачы вывучэння вучэбнай дысцыпліны*:

набыццё і засваенне сучасных ведаў, развіццё прафесійных кампетэнцый з мэтай паспяховага ажыццяўлення творчай дзейнасці ў сваёй мясцовасці;

авалоданне арганізацыйнымі падыходамі выкарыстання этнакультурных традыцый беларускага народа ў прафесійнай дзейнасці;

ажыццяўленне прафесійнай самаадукацыі і асобаснага росту арганізатара культурна-адпачынкавай дзейнасці.

*Метады навучання:* тлумачальна-ілюстрацыйны, інфармацыйна-традыцыйныя – вербальныя і наглядныя; інтэрактыўныя – майстар-класы, гульнёвыя; камунікатыўныя.

*Сродкі навучання:* мультымедыйныя і камп’ютарныя сродкі навучання, відэаматэрыялы, метадычныя дапаможнікі.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ СЛУХАЧОЎ

Вывучэнне зместу вучэбнай праграмы павінна забяспечыць фарміраванне спецыялізаваных прафесійных кампетэнцый, неабходных спецыялісту для

*Ажыццяўлення відаў прафесійнай дзейнасці:*

арганізацыйная дзейнасць;

выхаваўчая работа з насельніцтвам;

сцэнарна-праектная дзейнасць.

*Выканання функцый прафесійнай дзейнасці:*

ажыццяўленне інфармацыйнай, асветніцкай, рэкрэацыйнай і культурна-адукацыйнай дзейнасці сярод насельніцтва;

арганізацыя аматарскіх мастацкіх калектываў, клубаў па інтарэсах у адпаведнасці з культурнымі патрэбамі насельніцтва;

стварэнне неабходных умоў для задавальнення запытаў асобы ў засваенні каштоўнасцей культуры, патрэб грамадства і дзяржавы ў фарміраванні асобы ў кантэксце вольнага часу.

*Рашэння задач пры выкананні функцый прафесійнай дзейнасці:*

стварэнне ўмоў для развіцця і рэалізацыі творчых здольнасцяў

(магчымасцяў) насельніцтва, набыцця імі ведаў, уменняў і навыкаў у сферы культуры, побыту, здаровага ладу жыцця, арганізацыі культурнага вольнага часу (свабоднага часу) насельніцтва, атрымання актуальнай інфармацыі і прыкладных ведаў у розных галінах грамадскага жыцця;

садзейнічанне фарміраванню ў насельніцтва маральнай, прававой, экалагічнай, эстэтычнай і фізічнай культуры;

уцягванне насельніцтва ў працэс асветы, аматарскай творчасці і арганізацыі адпачынку і забаў;

распрацоўка і складанне праграм культурна-дасугавых мерапрыемстваў рознай накіраванасці;

правядзенне масавых тэатралізаваных свят і прадстаўленняў, народных гулянняў, абрадаў і рытуалаў у адпаведнасці з мясцовымі звычаямі і традыцыямі;

рэалізацыя напрамкаў выхаваўчай і ідэалагічнай работы з рознымі групамі насельніцтва;

вырашэнне сацыяльна значных задач з рознымі групамі насельніцтва;

вывучэнне, абагульненне, прапаганда, распаўсюджванне і ўкараненне перадавога вопыту работы ўстаноў, якія забяспечваюць арганізацыю культурнага адпачынку (вольнага часу) насельніцтва.

## КАМПЕТЭНЦЫІ, ЯКІЯ ФАРМІРУЮЦЦА

Слухач, які засвоіў змест вучэбнай дысцыпліны "Асновы этнаграфіі і фальклору", павінен валодаць наступнымі спецыялізаванымі прафесійнымі кампетэнцыямі:

СП 4. Ведаць гісторыю фарміравання беларускага этнасу, структуру рытуальна-абрадавых комплексаў, сістэму жанраў беларускага фальклору, асаблівасці ўзаемаадносін абрадавай практыкі і абрадавай паэтыкі;

СП 5. Умець выкарыстоўваць у прафесійнай дзейнасці этнакультурныя традыцыі беларускага народа.

У адпаведнасці з прыкладным вучэбным планам па спецыяльнасці перападрыхтоўкі агульная колькасць вучэбных гадзін, адведзеная на вывучэнне зместу вучэбнай дысцыпліны – 36, працаёмкасць складае 1 заліковую адзінку (крэдыт).

Згодна з вучэбным планам па спецыяльнасці перападрыхтоўкі размеркаванне вучэбных гадзін па відах заняткаў у завочнай форме атрымання адукацыі: лекцыі – 12, практычныя заняткі – 4, круглыя сталы, тэматычныя дыскусіі – 2, самастойная праца – 18.

## ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН
### вучэбнай дысцыпліны, модуля

| Найменні раздзелаў модуляў, дысцыплін, тэм і формаў бягучай, прамежкавай атэстацыі | Колькасць вучэбных гадзін | | | | | | | | | | Этапы | Кафедра (цыклавая камісія) |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | усяго | размеркаванне па відах заняткаў | | | | | | | | | | |
| | | аўдыторныя заняткі | | | | | | | | самастойная работа | | |
| | | лекцыі | практычныя заняткі | семінарскія заняткі | круглыя сталы, тэматычныя дыскусіі | лабараторныя заняткі | дзелавыя гульні | трэнінгі | канферэнцыі | | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 | 13 |
| **РАЗДЕЛ І ТРАДЫЦЫЙНАЯ КУЛЬТУРА БЕЛАРУСАЎ** | **22** | **8** | **2** | | **2** | | | | | **10** | **1** | Кафедра культуралогіі і псіхолага-педагагічных дысцыплін |
| Тэма 1.1. Гісторыка-культурныя рэгіёны Беларусі: характэрныя асаблівасці матэрыяльнай і духоўнай культуры | 6 | 2 | | | | | | | | 4 | 1 | |
| Тэма 1.2. Міфапаэтычная мадэль свету беларусаў | 8 | 4 | | | 2 | | | | | 2 | 1 | |
| Тэма 1.3. Традыцыйны беларускі каляндар: гісторыя фарміравання, дыялог культур, сістэма сацыякультурных каштоўнасцей | 8 | 2 | 2 | | | | | | | 4 | 1 | |
| **РАЗДЕЛ ІІ ФАЛЬКЛОР У ЯГО ЖАНРА-ВІДАВЫХ І АБРАДАВЫХ КОМПЛЕКСАХ** | **14** | **4** | **2** | | | | | | | **8** | **1** | |
| Тэма 2.1. Сямейна-родавыя абрады: радзіны (хрэсьбіны), вяселле, пахавальна-памінальныя рытуалы | 8 | 2 | 2 | | | | | | | 4 | 1 | |
| Тэма 2.2. Жанравы склад беларускага фальклору | 6 | 2 | | | | | | | | 4 | 1 | |
| Форма бягучай атэстацыі (пры неабходнасці з указаннем раздзела, тэмы) | – | | | | | | | | | | – | |
| **Форма прамежкавай атэстацыі па вучэбнай дысцыпліне** | **Залік** | | | | | | | | | | **1** | |

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ

## РАЗДЗЕЛ І
## ТРАДЫЦЫЙНАЯ КУЛЬТУРА БЕЛАРУСАЎ

**Тэма 1.1. Гісторыка-культурныя рэгіёны Беларусі: характэрныя асаблівасці матэрыяльнай і духоўнай культуры** (6 гадзін, з іх: лекцыя – 2, самастойная работа – 4)

Гісторыка-этнаграфічныя рэгіёны. Паазер'е. Падняпроўе. Цэнтральная Беларусь. Панямонне. Усходняе і Заходняе Палессе. Разнастайнасць культурнага ландшафту. Багацце беларускай традыцыйна-бытавой культуры. Прыстасаванасць народнай культуры і побыту да мясцовых экалагічных і гістарычных умоў. Рэгіянальныя і лакальныя варыянты народнай культуры. Агульныя рысы народнай культуры сумежных зон. Гістарычныя змены ў культурным ландшафце і геаграфіі рэгіёнаў. Роля рэк як гістарычных шляхоў зносін і кампанентаў ландшафту.

Народнае жыллё, промыслы і рамёствы.

Народная кухня.

*Пералік заданняў для самастойнай работы*

*Заданне* (4 гадзіны)

З выкарыстаннем рэкамендаванай літаратуры вывучыць наступныя пытанні:

1. Гісторыка-этнаграфічныя рэгіёны Беларусі.
2. Характарыстыка аднаго з рэгіёнаў адпаведна свайму месцу пражывання/працы.
3. Народная кухня беларусаў у сённяшнім свеце.

*Літаратура для самастойнага вывучэння*

1. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў : у 6 тамах і 10-і кнігах. 2001–2013. Адпаведна свой рэгіён.
2. Цітоў, В. С. Этнаграфічная спадчына: Беларусь: Краіна і людзі / В. С. Цітоў. – 2-ое выд. – Мн. : Беларусь, 2001. – С. 55–136.

**Тэма 1.2. Міфапаэтычная мадэль свету беларусаў** (8 гадзін, з іх: лекцыя – 4; круглы стол – 2, самастойная работа – 2)

Міфалогія як форма светапогляду даўніх беларусаў. Касмаганічныя ўяўленні, міфалагемы (агню, вады, зямлі, паветра). Камунікатыўная прырода дачыненняў чалавека і свету. Міфалогія жытла ў беларускай традыцыйнай культуры. Сімволіка жывёл і раслін у міфалагічных уяўленнях.

Паняцце сакральнай геаграфіі, месцы святыя, культавыя. Шанаванне прыроды і гарманічныя ўзаемаадносіны з ёй як вытворная прынцыпы традыцыйнага светаразумення. Веды і звычаі, датычныя прыроды і Сусвету. Дахрысціянскія вытокі і сучасныя народна-хрысціянскія формы ўшанавання крыніц, камянёў, прошчаў.

Сістэма беларускай народнай медыцыны: праблемы суадносінаў рацыянальнага і сімвалічнага. Знахарства ў посттрадыцыйным грамадстве: узровень захаванасці, функцыянальнасць і калектыўныя стэрэатыпы.

*Пытанні для абмеркавання на круглым стале*

1. Сістэма святых мясцін у вашай мясцовасці і асаблівасці іх ушанавання.
2. Традыцыйныя веды аб раслінным і жывёльным свеце і іх укаранёнасць у сучасным жыцці.
3. Роля народнай медыцыны ў жыццезабеспячэнні сучаснай вёскі і горада.

*Пералік заданняў для самастойнай работы*

*Заданне* (2 гадзіны)

З выкарыстаннем рэкамендаванай літаратуры вывучыць наступныя пытанні:

1. Дахрысціянскія ўяўленні нашых продкаў.
2. Сімволіка жывёл і раслін у міфалагічных уяўленнях.
3. Святыя месцы вашай мясцовасці і дзейнасць устаноў культуры.

*Літаратура для самастойнага вывучэння*

1. Валодзіна, Т. В. Святыя крыніцы Беларусі / У. А. Лобач, Т. В. Валодзіна. – Мінск : Беларуская навука, 2016. – С. 5–29.

2. Трошкі бліжэй да Сонца, трошкі далей ад Месяца: беларуская народная філасофія / Т. В. Валодзіна [і інш.] ; уклад. і агул. рэд.: І. М. Дубянецкая, С. І. Санько ; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т філасофіі. – Мінск : Беларуская навука, 2022. – С. 40–182.

**Тэма 1.3. Традыцыйны беларускі каляндар: гісторыя фарміравання, дыялог культур, сістэма сацыякультурных каштоўнасцей** (8 гадзін, з іх: лекцыя – 2, практычны занятак – 2, самастойная работа – 4)

Каляндарныя святы і абрады як складаны культурны комплекс, у якім спалучаюцца практычны вопыт і рэлігійна-магічныя вераванні. Сістэма ўпарадкавання часу, каляндарныя сезоны, цыклы, перыяды. Архаічны змест каляндарнай звычаёвасці, міфалогія і прагматыка свята. Кардынальныя для каляндарнай абраднасці ідэі магічнага стымулявання прыроднага парадку і падтрымання неабходнай раўнавагі ў адносінах з наваколлем. Царкоўна-хрысціянскі каляндар як маркер святочнага часу. Святы пастаянныя і рухомыя, прысвяткі.

Культ продкаў – структураўтваральны прынцып традыцыйнага календара.

Зімовы цыкл каляндарна-абрадавай паэзіі. Куцця і Дзяды. Феномен калядных “хаджэнняў” і “ваджэнняў”. Рытуальныя калядныя гульні і іх паэзія (“Жаніцьба Цярэшкі”, “Яшчур” і інш). Калядныя варожбы.

Веснавы цыкл каляндарна-абрадавай паэзіі. Масленічныя песні. Гуканне вясны. Асноўныя матывы, рытуальна-міфалагічны змест і паэтыка вяснянак. Валачобныя песні. Веснавыя карагодныя і гульнёвыя песні. Юраўскія песні. Песні абраду ваджэння і пахавання “стралы”. Траецкія, куставыя і майскія песні.

Русальныя песні, іх арэал.

Летні цыкл каляндарна-абрадавай паэзіі. Склад летніх песень (купальскія, пятроўскія, касецкія, жніўныя песні). Адметнасць талочных песень. Вобразы талакі і гаспадароў.

Восеньскі цыкл каляндарна-абрадавай паэзіі. Восеньскія каляндарныя песні – адметная асаблівасць беларускага фальклору. Прыродны, працоўны, бытавы кантэксты восеньскіх песень. Прадзільныя (піліпаўскія) песні.

*Пералік заданняў для самастойнай работы*

*Заданне* (4 гадзіны)

З выкарыстаннем рэкамендаванай літаратуры вывучыць наступныя пытанні:

1. Каляндарныя абрады і святы: цыклы, структура, каштоўнасці.
2. Прадуцыравальная магія і шанаванне продкаў.
3. Каляндарныя песні, ігрышчы, карагоды.

*Літаратура для самастойнага вывучэння*

1. Валодзіна, Т. В. "Ядраное жыта гаспадара кліча…": каляндарны год у абрадах і звычаях / Т. В. Валодзіна, Т. І. Кухаронак. – Мінск : Беларуская навука, 2015. – С. 5–10, 17–303.
2. Кірчук, І. І. Кветка Перуна : каляндарна-абрадавы даведнік / І. Кірчук, К. Кірчук. – Мінск : НПП Регула, 2022. – С. 15–27.
3. Ляшкевіч, А. І. Традыцыйны каляндар : нарысы / А. І. Ляшкевіч. – Мінск : Беларуская навука, 2022. – С. 9–131.

## РАЗДЗЕЛ ІІ
## ФАЛЬКЛОР У ЯГО ЖАНРА-ВІДАВЫХ І АБРАДАВЫХ КОМПЛЕКСАХ

**Тэма 2.1. Сямейна-родавыя абрады: радзіны (хрэсьбіны), вяселле, пахавальна-памінальныя рытуалы** (8 гадзін, з іх: лекцыя – 2, практычны занятак – 2, самастойная работа – 4)

Этнадэмаграфічныя працэсы. Гісторыя беларускай сям'і: традыцыі і сучаснасць. Тыпы і структура сям'і. Радавод і сістэма сваяцтва. Сямейныя традыцыі і народная педагогіка. Сацыяльныя і рэгіянальныя асаблівасці сям'і, сямейных звычаяў і абрадаў.

Сямейна-радавыя, рытуальна-абрадавыя комплексы: радзіны, вяселле, пахаванне. Пахавальная абраднасць у гісторыі культуры. Семантыка і сімволіка пахавальнай абраднасці. Мемарыяльныя помнікі і знакі, іх сакральна-этычныя, выхаваўчыя і этнакультурныя функцыі. Этнаканфесійныя і рэгіянальныя асаблівасці пахаванняў. Культ продкаў.

Адзенне як своеасаблівы пашпарт чалавека. Утылітарна-практычныя, этнакультурныя, эстэтычныя, абрадавыя функцыі адзення. Семантыка і сімволіка асобных частак адзення.

*Пералік заданняў для самастойнай работы*

*Заданне* (4 гадзіны)

З выкарыстаннем рэкамендаванай літаратуры вывучыць наступныя пытанні:

1. Жыццёвы шлях чалавека ў абрадах і звычаях.

2. Сямейныя традыцыі, народная педагогіка, пахавальна-памінальны комплекс у сённяшнім жыцці.

3. Развіццё і сімволіка адзення ў жыццёвым цыкле чалавека.

*Літаратура для самастойнага вывучэння*

1. Трошкі бліжэй да Сонца, трошкі далей ад Месяца: беларуская народная філасофія / Т. В. Валодзіна [і інш.] ; уклад. і агул. рэд.: І. М. Дубянецкая, С. І. Санько ; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т філасофіі. – Мінск : Беларуская навука, 2022. – С. 267–292.

**Тэма 2.2. Жанравы склад беларускага фальклору** (6 гадзін, з іх: лекцыя – 2, самастойная работа – 4)

Пазаабрадавы фальклор: празаічныя жанры (казка, паданне, легенда); балады. Народная лірыка (сацыяльна-бытавыя песні, любоўныя песні, сямейна-бытавыя песні, прыпеўка). Малыя фальклорныя жанры: прымаўкі; прыказкі; загадкі; прыкметы і павер'і. Драматычныя тэксты і дзеянні: гульні, карагоды; сцэнкі, п'есы.

*Пералік заданняў для самастойнай работы*

*Заданне* (4 гадзіны)

З выкарыстаннем рэкамендаванай літаратуры вывучыць наступныя пытанні:

1. Народная песня як выказнік душы і менталітэту народа.

2. Песня аўтэнтычная і самадзейная творчасць.

3. Карагодная культура беларусаў.

*Літаратура для самастойнага вывучэння*

1. Беларускі фальклор : энцыклапедыя : у 2 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 2005. – Т. 1. – С. 477–481, 606–609. – Т. 2. – С. 17–20, 389–392.

2. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў : у 6 тамах і 10-і кнігах. 2001-2013. Адпаведна свой рэгіён.

## КАНТРОЛЬ І АЦЭНКА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

Праверка вынікаў самастойнай работы слухачоў ажыццяўляецца выкладчыкам падчас правядзення практычных заняткаў, круглых сталоў і прамежкавай атэстацыі слухачоў.

Пытанні і заданні па тэматыцы самастойнай работы ўключаюцца ў матэрыялы для прамежкавай атэстацыі слухачоў.

*Форма прамежкавай атэстацыі слухачоў па вучэбнай дысцыпліне “Асновы этнаграфіі і фальклору” – залік, які праводзіцца па пытаннях да заліку ў вуснай форме на 1 этапе навучання.*

## МАТЭРЫЯЛЫ ДЛЯ ПРАМЕЖКАВАЙ АТЭСТАЦЫІ СЛУХАЧОЎ

### ПЫТАННІ ДА ЗАЛІКУ

1. Рэгіянальны падзел этнічнай тэрыторыі. Геаграфічнае размяшчэнне рэгіёнаў.
2. Асаблівасці традыцыйна-бытавой культуры ў розных рэгіёнах Беларусі.
3. Паняцце “фальклор” і яго разнавіднасці.
4. Матэрыяльная культура беларусаў.
5. Асаблівасці духоўнай культуры беларусаў.
6. Шляхі фарміравання, архітэктоніка і семантыка традыцыйнага календара.
7. Культ продкаў – структураўтваральны прынцып традыцыйнага календара.
8. Паходжанне абрадаў, прысвечаных асабістаму жыццю чалавека.
9. Сацыяльныя і рэгіянальныя асаблівасці сям’і, сямейных звычаяў і абрадаў.
10. Новы год у вусным народна-паэтычным календары беларусаў.
11. Зімовыя абрады і песні.
12. Хрысціянскі складнік каляднай абраднасці. Ражство і Вадохрышча.
13. Святы і каляндарна-абрадавая паэзія веснавога перыяду.
14. Паэзія і абраднасць лета.
15. Восеньскія песні і абраднасць.
16. Радзінная і хрэсьбінная абраднасць і паэзія.
17. Вясельная паэзія. Асаблівасці мастацкіх вобразаў і паэтычнай мовы вясельнай паэзіі.
18. Хаўтурныя галашэнні. Дзяды.
19. Вяселле: абраднасць і песні.
20. Пахавальныя і памінальныя абрады.
21. Пазаабрадавая паэзія: песні пра каханне, сямейна-бытавыя песні, балады і жорсткія рамансы.
22. Пазаабрадавая паэзія: жартоўныя песні, прыпеўкі, карагодныя, танцавальныя і гульнёвыя песні.
23. Казкавая проза.
24. Легенды, паданні, вусныя апавяданні, быліčкі.
25. Выслоўі, загадкі, прыказкі і прымаўкі, прыкметы і павер’і.
26. Замовы і народная медыцына.
27. Святыя мясціны маёй мясцовасці.
28. Традыцыйныя веды як сродак спазнання свету і чалавека ў ім.
29. Арганізацыя і задачы фальклорна-этнаграфічнай экспедыцыі.
30. Уяўленні пра знахарства і яго развіццё ў сённяшнім свеце.
31. Адзенне як своеасаблівы пашпарт чалавека.
32. Асаблівасці і роля народнай кухні беларусаў.

Абмеркаваны і адобраны на пасяджэнні кафедры культуралогіі і псіхолага-педагагічных дысцыплін Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў». Пратакол пасяджэння ад 12.03.2024 № 5.

## ПЕРАЛІК НЕААБХОДНЫХ ВУЧЭБНЫХ ВЫДАННЯЎ


*Асноўная літаратура*

1. Ляшкевіч, А. І. Традыцыйны каляндар : нарысы / А. І. Ляшкевіч. – Мінск : Беларуская навука, 2022. – С. 5–315.
2. Трошкі бліжэй да Сонца, трошкі далей ад Месяца: беларуская народная філасофія / Т. В. Валодзіна [і інш.] ; уклад. і агул. рэд.: І. М. Дубянецкая, С. І. Санько ; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т філасофіі. – Мінск : Беларуская навука, 2022. – С. 40–182, 267–292.

*Дадатковая літаратура*

3. Беларускі фальклор : энцыклапедыя : у 2 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 2005. – Т. 1. – С. 477–481, 606–609.
4. Беларускі фальклор : энцыклапедыя : у 2 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 2006. – Т. 2. – С. 17–20, 389–392.
5. Валодзіна, Т. В. “Ядраное жыта гаспадара кліча…”: каляндарны год у абрадах і звычаях / Т. В. Валодзіна, Т. І. Кухаронак. – Мінск : Беларуская навука, 2015. – С. 5–343.
6. Валодзіна, Т. В. Святыя крыніцы Беларусі / У. А. Лобач, Т. В. Валодзіна. – Мінск : Беларуская навука, 2016. – С. 5–29.
7. Кірчук, І. І. Кветка Перуна : каляндарна-абрадавы даведнік / І. Кірчук, К. Кірчук. – Мінск : НПП Регула, 2022. – С. 15–27.
8. Лобачевская, О. А. Белорусский народный костюм: крой, вышивка и декоративные швы / О. А. Лобачевская, З. Зимина. – 4-е изд. – Минск : Беларуская навука, 2022. – С. 10–25.
9. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў : у 6 т. / А. М. Боганева [і інш.] ; аўт. ідэі Т. Б. Варфаламеева ; агул. рэд. Т. Б. Варфаламеевай. – Мінск : Вышэйшая школа, 2006. – Т. 3 : Гродзенскае Панямонне : у 2 кн. – Кн. 2. – С. 20–33, 273–309.
10. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў : у 6 т. / А. М. Боганева [і інш.] ; ідэя і агул. рэд. Т. Б. Варфаламеевай. – Мінск : Вышэйшая школа, 2011. – Т. 5 : Цэнтральная Беларусь : у 2 кн. – Кн. 2. – С. 13–204, 539–589.
11. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў : у 6 т. / А. М. Боганева [і інш.] ; ідэя і агул. рэд. Т. Б. Варфаламеевай. – Мінск : Вышэйшая школа, 2013. – Т. 6 : Гомельскае Палессе і Падняпроўе : у 2 кн. – Кн. 2. – С. 28–123, 841–856.
12. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў : у 6 т. / аўт. кал. : Т. Б. Варфаламеева (навук. кір. і скл.). – Мінск : Беларус. навука, 2001. – Т. 1 : Магілёўскае Падняпроўе. – С. 9–360, 697–710.
13. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў : у 6 т. / В. І. Басько [і інш.] ; ідэя і агул. рэд. Т. Б. Варфаламеевай. – Мінск : Вышэйшая школа, 2008. – Т. 4 : Брэсцкае Палессе : у 2 кн. – Кн. 1. – С. 11–422.
14. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў : у 6 т. / В. І. Басько [і інш.] ; ідэя і агул. рэд. Т. Б. Варфаламеевай. – Мінск : Вышэйшая школа, 2010. – Т. 5 : Цэнтральная Беларусь : у 2 кн. – Кн. 1. – С. 12–674.
15. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў : у 6 т. / В. І. Басько

[і інш.] ; аўт. ідэі Т. Б. Варфаламеева ; агул. рэд. Т. Б. Варфаламеевай. – Мінск : Вышэйшая школа, 2006. – Т. 3 : Гродзенскае Панямонне : у 2 кн. – Кн. 1. – С. 11–538.

16. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў : у 6 т. / Т. Б. Варфаламеева, А. М. Боганева, М. А. Козенка [і інш.]. – Мінск : Беларус. навука, 2004. – Т. 2 : Віцебскае Падзвінне. – С. 12–434, 539–713.

17. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў : у 6 т. / Т. В. Валодзіна [і інш.] ; ідэя і агул. рэд. Т. Б. Варфаламеевай. – Мінск : Вышэйшая школа, 2012. – Т. 6 : Гомельскае Палессе і Падняпроўе : у 2 кн. – Кн. 1. – С. 12–636.

18. Цітоў В. С. Этнаграфічная спадчына: Беларусь: Краіна і людзі / В. С. Цітоў. – 2-ое выд. – Мн. : Беларусь, 2001. – С. 55–136.

*Нарматыўныя прававыя акты*

1. Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь [Электронны рэсурс] // М-ва культуры Рэсп. Беларусь. – Рэжым доступу: http://kultura.gov.by. – Дата доступу: 12.02.2024.